# ВОБРАЗ КНЯЗЯ ДАЎМОНТА Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1980–2000-х гг.

*А.М. Дулаў*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Даўмонт (у праваслаўі Цімафей; ? – 1299) – князь нальшанскі і пскоўскі, воін, кананізаваны Праваслаўнай царквой, – значная фігура ў гісторыі Літвы, Беларусі і Пскоўшчыны. Яго драматычны лёс (абраза ад князя Міндоўга, які сілай адабраў жонку, помста і ўцёкі з радзімы, вернае служэнне Пскову) прыцягваў увагу гісторыкаў і публіцыстаў.

Мэта работы – ахарактарызаваць вобраз князя ў беларускім навуковым і сацыяльна арыентаваным гісторыяпісанні апошніх дзесяцігоддзяў.

**Матэрыял і метады.** Навуковая гістарычная біяграфістыка па сённяшні дзень не атрымала ў беларускай навуцы значнага развіцця. Таму крыніцамі для падрыхтоўкі працы паслужылі даследаванні, прысвечаныя праблеме ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага, і навукова-папулярныя нарысы. Выкарыстаны таксама апавядальныя крыніцы пра жыццё і дзейнасць князя Даўмонта, найперш Галіцка-Валынскі летапіс, створаны ў канцы XIII ст., і «Сказание о благовѣрнемь князи Довмонтѣ и о храбрости его», што дайшло ў складзе трох пскоўскіх летапісаў і датуецца не пазней чым XIV ст.

У даследаванні рэалізаваны падыход, уласцівы для фенаменалагічнай канцэпцыі крыніцазнаўства. Намі прымяняліся агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя) і спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Дыскусію аб працэсе ўтварэння ВКЛ у айчыннай навуцы ўзняў М. Ермаловіч, філолаг па адукацыі, шчыры патрыёт і захоплены даследчык. У яго кнізе «Па слядах аднаго міфа» (напісаная ў 1960-я гг., распаўсюджвалася самвыдатам, была выдадзена ў 1989 г.) Даўмонт прадстаўлены як перабежчык, які стаў ворагам роднай зямлі [2, с. 58]. Для доказу гэтага тэзісу аўтар прыводзіць звесткі з Наўгародскага І летапісу пра паходы Даўмонта на Літву. У працы «Старажытная Беларусь: полацкі і новагародскі перыяды» М. Ермаловіч надаў увагу барацьбе Даўмонта з князем Нальшан Гердзенем, які, магчыма, ў 1260-х гг. княжыў і ў Полацку. Даследчык выказаў думку, якая не пацвярджаецца звесткамі крыніц, што паходы Даўмонта «на землю Литовскую» насамрэч былі скіраваныя на Полацкае княства [3, с. 328–330]. У апошняй кнізе М. Ермаловіч падкрэсліў ролю Даўмонта ў змове супраць Міндоўга, якая выявілася не толькі ва ўласнаручным забойстве апошняга: «Без саюза з Нальшчанамі, якія знаходзіліся паміж Літвой і Жамойціяй, Транята, вядома, і не мог марыць пра авалоданне Літвой. … Таму, згаварыўшыся з нальшчанскім князем Даўмонтам, Транята атрымаў вялікую перавагу над Міндоўгам» [1, с. 84].

У працах В. Насевіча і А. Краўцэвіча абставіны асабістага канфлікту паміж Міндоўгам і Даўмонтам раскрыты паводле звестак Галіцка-Валынскага летапісу [9, с. 51; 5, с. 164–165]. У адпаведнасці з гістарычнай рэчаіснасцю, нальшанскі князь прадстаўлены, галоўным чынам, у вобразах ахвяры і мсціцеля. Гэтаксама Даўмонт паказаны і ў папулярным нарысе А. Краўцэвіча [4, с. 147]. У кнізе В. Насевіча згадваецца таксама пскоўскі перыяд жыцця Даўмонта – прыняцце на княжанне, абарона горада ад крыжакоў, узвядзенне мураваных умацаванняў [9, с. 56–57, 61, 69].

Варта адзначыць, што ўпершыню да сюжэта пра канфлікт Міндоўга і Даўмонта звярнуўся яшчэ ў 1984 г. пісьменнік і публіцыст К. Тарасаў у кнізе «Память о легендах». Праз дзесяць гадоў з’явілася другое, дапоўненае выданне [11]. На падставе крыніц К. Тарасаў яскрава і пераканаўча аднавіў карціну асабістай драмы і помсты Даўмонта: «Вялікую крыўду перажыў Даўмонт і не было ў яго літасці да нікога. Ён забіў двух сыноў Міндоўга – Рэпіка і Руклю, а самога князя пасек, як капусту. Загінулі пры гэтым нападзе і былая жонка Даўмонта – трагічная ахвяра старэчай пахатлівасці вялікага князя, і ўся ягоная ахова» [11, с. 55]. К. Тарасаў выказаў меркаванне пра ўзрост удзельнікаў падзей: на яго думку, Міндоўгу было «каля сямідзесяці гадоў; Даўмонту – самае большае трыццаць, жонцы яго, згвалчанай Міндоўгам і за гэта забітай, наўрад ці прамінула дваццаць пяць» [11, с. 55].

Аўтар таксама паказаў далейшы лёс нальшанскага князя: пасля вяртання Войшалка, які помсціў за бацьку, Даўмонт збег у Пскоў, дзе быў абраны «баявым князем». «Тут ён хрысціўся ў праваслаўе, пражыў да 1299 года, ратаваў горад ад немцаў, хадзіў паходамі на літоўцаў і



Репозиторий ВГУ

ўвайшоў у гісторыю Пскова як адзін з найлепшых пскоўскіх князёў. Пры ім пачалося будаўніцтва муроў, што назаўсёды захавалі назву Даўмонтавых. Пасля смерці Даўмонт (хрысціянскае імя Цімафей) быў кананізаваны як пскоўскі святы, у царкве знаходзіўся ягоны меч, якім апяразвалі кожнага новага князя. У Пскове Даўмонт ажаніўся, і тут нарадзіўся ў яго сын, названы пры хрышчэнні Давыдам, якому лёс наканаваў вярнуцца на радзіму і ўславіць яе ваенным талентам» [11, с. 56].

Адной з нешматлікіх работ, у якой аўтар зрабіў спробу рэканструяваць гістарычны партрэт князя Даўмонта, прычым з выкарыстаннем літаратурна-мастацкіх сродкаў, з'яўляецца нарыс В. Чаропкі ў кнізе «Імя ў летапісе» (першае выданне ўбачыла свет у 1994 г.). Даўмонт прадстаўлены не толькі як ахвяра Міндоўга, што адпомсціла крыўдзіцелю, але і як асоба трагічная, заложнік абставін. Воляй лёсу князь апынуўся ў сітуацыі, якая не пакінула іншага выбару. І хоць Даўмонт заслужыў на пскоўскім княжым стале славу і павагу, яго не пакідала туга па роднай зямлі [12, с. 153]. В. Чаропка таксама падкрэсліў ператварэнне душы князя пад уздзеяннем хрысціянства [12, с. 160]. Напрыканцы нарыса гаворыцца пра вяртанне на радзіму сына Даўмонта – Давыда, які стане кашталянам Гародні і праславіцца ў барацьбе супраць крыжакоў. Давыду аўтар прысвяціў асобны нарыс. Паказ пераемнасці, намечаны і ў К. Тарасава, узмацняе характарыстыку князя як бацькі, які выхаваў вартага сына.

У цэлым падобную характарыстыку князя Даўмонта і яго лёсу даюць І. Масляніцына і М. Багадзяж у сваіх папулярных нарысах пра ролю жанчыны і кахання ў беларускай гісторыі [7, с. 97–98; 6, с. 12–15, 30–37]. У кнізе І. Масляніцынай князь паказаны як надзейны сябра, добры муж (другой жонкай Даўмонта-Цімафея была дачка або сястра Дзмітрыя Аляксандравіча, сына Аляксандра Яраславіча (Неўскага) і бацька [6, с. 30–37].

Вобраз князя аднаўляецца таксама ў нарысе "Благоверный Довмонт, во святом крещении Тимофей, князь Литовский, князь Псковский" у навукова-папулярнай кнізе гісторыка літаратуры А. Мельнікава [8, с. 163–170]. Тут акцэнт зроблены на подзвігах князя ў перыяд княжання ў Пскове, прыведзены звесткі пра цуды, якімі Госпад праславіў мошчы князя, а таксама разгледжаны рэдакцыі жыціййнага сказання аб Даўмонце-Цімафеі. На старонках нарыса А. Мельнікава князь Даўмонт паўстае як мужны і ўмелы воін і вайскаводца, правіцель, які клапаціўся «как об укреплении городских стен, так и об утверждении в жителях христианского благочестия». «Кроме того, что благоверный князь Довмонт сделал псковскую крепость неприступной, он каждый раз, возвращаясь с победой, возводил рядом с Кремлем церкви во имя святых, в день памяти которых победа была одержана» [8, с. 167]. З апорай, галоўным чынам, на сказанне аб Даўмонце А. Мельнікаў стварыў вобраз ідэальнага князя – смелага воіна і мудрага правіцеля, дабрачыннага хрысціяніна, які сваім падзвіжніцтвам заслужыў далучэння да ліку святых. Падобны вобраз прадстаўлены таксама ў пераказе сказання аб Даўмонце для дзяцей [9].

**Заключэнне.** Такім чынам, навуковая біяграфія князя Даўмонта ў беларускай гістарыяграфіі адсутнічае. У працах, прысвечаных утварэнню ВКЛ, даследчыкі падавалі дзейнасць Даўмонта ў строгай адпаведнасці з інфармацыяй гістарычных крыніц. Князь паўстае найперш як ахвяра Міндоўга і як мсціцель, вымушаны пакінуць радзіму. На крыніцы абапіраліся і папулярызатары гістарычных ведаў, часам больш вольныя ў сваіх інтэрпрэтацыях ці схільныя да ідэалізацыі Даўмонта-Цімафея. Тут вялікая ўвага нададзена перыяду княжання яго ў Пскове, таму да акрэсленага вышэй вобраза дадаюцца характарыстыкі ідэальнага князя-пераможцы крыжакоў, дабрачыннага хрысціяніна, добрага мужа і бацькі, надзейнага сябра.

Спіс літаратуры


1. Ермаловіч, М.І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае / М.І. Ермаловіч. – Мінск: Беллітфонд, 2000. – 435 с.
2. Ермаловіч, М.І. Па слядах аднаго міфа / М.І. Ермаловіч. – 2-е выд., дап. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 98 с.
3. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: полацкі і новагародскі перыяды / М.І. Ермаловіч. – 2-е выд. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 366 с.
4. Краўцэвіч, А. Міндаўг – Mindauh: Пачатак гаспадарства: нарыс / А. Краўцэвіч. – Мінск: Маст. літ., 2005. – 163 с.
5. Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага / А.К. Краўцэвіч. – 2-е выд. – Rzeszow, 2000. – 238 с.
6. Масленицына, И.А. По рыцарским законам / И.А. Масленицына. – Минск: Полымя, 2001. – 208 с.
7. Масляніцына, І.А. Слава і няслаўе / І.А. Масляніцына, М.К. Багадзяж. – Мінск: Народная асвета, 1995. – 255 с.
8. Мельников, А.А. Путь непечален: исторические свидетельства о святости Белой Руси / А.А. Мельников. – Минск: Белорусская Православная Церковь, 1992. – 239 с.
9. Насевіч, В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: падзеі і асобы / В.Л. Насевіч. – Мінск: Полымя, 1993. – 160 с.
10. Святой благоверный Довмонт (Тимофей), князь псковский / пересказали для детей И. А. Масленицына и Н. К. Богодяж. – Минск: Белорусская Православная Церковь, 2009. – 17 с.
11. Тарасаў, К. Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны / К. Тарасаў. – 2-е выд., дап. – Мінск: Полымя, 1994. – 270 с.
12. Чаропка, В. Імя ў летапісе / В. Чаропка. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Беларусь, 2003. – 639 с.




Рэпазіторый ВДУ